падземнымі замкавымі катакомбамі) сцвярджае развіццё традыцыі В. Ластоўскага, па-наватарску паказваючы аднанакіраванасць і лагічную сэнсавую завершанасць шляху героя ў выніку спасціжэння і раскрыцця трагічных па сваім характары гістарычных таямніц. Вобраз шляху, такім чынам, з'яўляецца адным з устойлівых хранатопаў у беларускай прозе XX стагоддзя.

**Літаратура**


1. Арутюнова Н. Метафора и дискурс // Теория метафоры: Сборник. М.: Прогресс, 1990. С. 5–32.
2. Иванов В. Родное и вселенское. М.: Республика, 1994. 428 с.
3. Багдановіч І. Містычнае ў ранняй прозе М. Гарэцкага і В. Ластоўскага // Гарэцкія чытанні: Матэр. дакл. і павед. на VII, VIII, IX, X чытаннях. Мінск: Беларускае выд-ва Таварыства "Хата", 2002. С. 9–13.
4. Ластоўскі В. Выбраныя творы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. 512 с.
5. Гарошка Л. Дахрысціянская вера нашых продкаў // Крыніца. 1994. № 8. С. 74–78.
6. Гарэцкі М. Творы: Дзве душы: Аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч: П'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. Мінск: Маст. літ., 1990. 629 с.
7. Гарэцкі М. Скарбы жыцця // Полымя. 1993. № 2. С. 16–128.
8. Караткевіч У. Збор твораў: У 8 т. Т. 7. Дзікае паляванне караля Стаха: Аповесць; Чорны замак Альшанскі: Раман. Мінск: Маст. літ., 1990. 574 с.


**У.А. Навумовіч**

## ЭВАЛЮЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ АПОВЕСЦІ XX СТАГОДДЗЯ: ПРАБЛЕМА ЖАНРУ

У гісторыі беларускай літаратуры аповесць займае асаблівае месца і мае выключна адметнае значэнне.

Падобнае сцверджанне пацвярджаецца ўсім ходам станаўлення беларускай мастацкай прозы на самых розных этапах яе развіцця. Можна сказаць, што асноўныя здабыткі (не прыніжаючы значэння іншых мастацкіх форм) у беларускай літаратуры ляжаць менавіта ў гэтым жанры. Беларуская літаратура – літаратура, найперш, аповесці. Кожны новы этап ва ўмацаванні і росквіце беларускага мастацкага слова сведчыць аб змястоўнасці дадзенай жанравай формы і аб яе выключнай рашаючай ролі ў мастацкай практыцы беларускіх пісьменнікаў, у насычанасці жывога літаратурнага працэсу.

Усё гэта дае падставы з вялікай доляй упэўненасці запэўніваць, што развіццё і эвалюцыя беларускай аповесці – з'ява фенаменальная, рэдкая і

ўнікальная ў беларускай літаратуры. Абгрунтаванне ўсяму сказанаму вышэй – жывая повязь часу, непарыўная сувязь пакаленняў у літаратуры, хутказменлівы, але і інтэнсіўны жывы літаратурны працэс, відавочнае ўзаемадзеянне традыцый і наватарства ў мастацтве слова.

Вядома, што старажытнае мастацтва слова не ведала такога жанру. Як вядома, адсутнічае жанр аповесці ў шэрагу еўрапейскіх і сусветных літаратур. Напрыклад, у французскай літаратуры ўсё, што з’яўляецца большым за памеры навелы (апавядання), называецца раманам.

Што ўключае ў сябе жанр аповесці?

Даволі трывала замацавалася думка ў нашым літаратуразнаўстве, што аповесць – мастацкі твор з нешырокім колам дзеючых асоб, абмежаванасцю дзеяння. Яна мае не такі разгалінаваны сюжэт, як, скажам, у рамане, без асаблівых хітраспляценняў лёсаў, перэпетый праяўленняў характараў, “зігзагаў душы”, глыбінь псіхалогіі, без “раскручвання” і “закручвання” падзейных “вузлоў”, сімпатыі і антыпатыі персанажаў у якой упаўне выразныя, празрыстыя.

Калі гаварыць вобразна, дык аповесць – гэта яшчэ не ўсё дзеянне, падзея, з’ява, а іх фрагмент, адзін ці два, а, магчыма, і больш, цэлы каледайскоп падзей і з’яў, але абавязкова не ўся панарама дзеяння, а галоўная яе частка – выйгрышная ці невыйгрышная, у залежнасці ад аўтарскай задумы, іншымі словамі, – момант ісціны, час прыняцця рашэння. У полі зроку аповесці – несумненна, кароткай празаічнай формы – знаходзіцца не ўсё жыццё чалавека, а яго кульмінацыйныя моманты, калі персанажы вымушаны рабіць той ці іншы выбар, ставяцца перад фактам, перажываюць парогавыя, стрэсавыя, альтэрнатыўныя сітуацыі, калі даследаванне ўнутранага стану і матываў паводзін, самога ўчынку асобы вядзецца ў момант найвышэйшага напружання фізічных і духоўных сіл чалавека, на своеасаблівых “піках” кардыяграмы чалавечых адчуванняў, пры “рэнтгенаскапіі” душы, духоўным “узі” сэрца.

Такі твор мастацкага слова – аповесць у беларускай літаратуры – вельмі нагадвае народную вышыўку, вязь, арнамент, яркі ўзор на палатне. Ды падобны не на ўвесь малюнак на палатне – габелен, вышыўку, ткацтва, масляны холст, а на паасобны фрагмент яго. Няцяжка ўявіць сабе, што калісьці жанчыны-майстрыцы на вёсцы, беручыся за рукадзелле, вышыўку, абавязкова перад усім “нацягвалі” белы абрусік ці даматканае палатно на драўляную рамачку, гэта маглі быць кольца ці квадрат, трапецыя – для зручнасці, а тады ўжо на тым натужным полі вялізарнага палотнішча

накідвалі першы ўзор. І так крок за крокам. Спачатку на ражку настольніка ці рушніка, а затым ужо ў сярэдзіне, а сам арнамент вышываўся па баках.

Аповесць – гэта і ёсць падобны фрагмент велізарнейшага палотнішча жыцця, габелена веку. Вышыўка палатна "па рамачцы". Што будзе вышыта, залежыць ад тврчых здольнасцей мастака, ад ягонага жыццёвага вопыту. Якія межы "рамачнага" дзеяння ў аповесці таксама залежыць ад задумы творцы, глыбіні спасціжэння рэчаіснасці, ад размаху падзейнасці ў самой гісторыі чалавецтва. Нялёгка бывае, часам, вызначыць і першае, і другое, і трэцяе, і ўсё астатняе. Многае залежыць ад канкрэтнага жыццёвага матэрыялу, які бярэцца за аснову мастацкага асэнсавання, ад яркасці і глыбіні з'явы, характару персанажаў, разнастайнасці праяўленняў іх душы, эмоцый і пачуццяў самога пісьменніка. У аповесці ўсе гэтыя якасці праяўляюцца з найбольшай сілай, яны адчувальны для забеспячэння поспеху ў асабліва значнай меры.

На мастацкім палатне аповесці М. Гарэцкага "Меланхолія" "віціеватай" вяззю вышыты "Сумныя лісты" Лявона Задумы з вёскі Радзівілішкі з датамі ад 30/VI.1913, 1/VIII.1913, 2/VII.1913, 8/VII.1913, 11/VII.1913. І без дат да сябра дзяцінства і юнацтва: "Мой любы таварыш! Ну, вось, ужо позняя, трохі засмучоная вясна і пачатак гарачага лета. Скончыліся нарэшце практычныя заняткі, і ты можаш павіншаваць мяне: я скончыў школу...". Падобныя запісы ў "Згадцы пра Поўнач" – "Дзень у шэсцьдзесят сутак" М. Стральцова: "Вось жыву я цяпер у адным добрым месцы на адзіноце з лесам, восеньскай цішынёй, з не зразумелым пакуль мне самому набыткам душы. // Можа, будзе тое, можа, не, але адно сапраўды было: у чэрвені, летам, мы ляцелі на Поўнач".

Аповесць М. Стральцова "Адзін лапаць, адзін чунь" увогуле пачынаецца... вершам:

Замест уступу
Сон.
Сон.
Сон.
Ноччу бязлюднай і цёмнай,
Іду па зямлі.
Вышэзны і лёгкі,
Пакалыхваюся ад тугі.
Галава прыгнута пад небам
Я плачу.
Зоркі – слёзы мае...

...раптам казытліва стала спіне: над стрэшкай пограба імгліста ўсхапіўся снежны ўзвет, калюча зацерусіў у вочы; потым разам аціхла – чуваць было, як шаргаценнем спаўзаў па сцяне і ападаў долу вецер. Снежны пыл на ветках і на шчаках раставаў, і рабілася цёпла.

Кульмінацыйныя моманты грамадзянскай вайны ў аповесцях героіка-прыгодніцкага зместу "Маладняка" – аўтараў літаратурнага аб'яднання: А. Вольнага "Два", "Затока ў бурах" Я. Відука (Скрыгана), "Мяцеліца" М. Нікановіча, "Рыгор Галота" Р. Мурашкі, "Свінапас" М. Чарота, "Ваўчаняты" А. Александровіча, А. Дудара, А. Вольнага, званага ўжо для большай важкасці "раманам беларускіх лясоў". Пераход вёскі на новыя рэйкі гаспадарання – добрыя ці дрэнныя, яшчэ невядома, але, несумненна, нязвыклыя і супраціўныя традыцыйнаму сялянскаму існаванню і стасункам з зямлёю.: "Межы", "Новая дарога" С. Баранавых. Перажытае, выпакутаванае ў "Сваёй аповесці" Б. Мікуліча. Засілле сацыяльнага зла ў аповесці "Вінаваты" П. Галавача. Развагі селяніна ў "Адшчапенец" Я. Коласа. "На прасторах жыцця" Я. Коласа – першы і адзіны даволі загадкавы твор кароткай формы ў гісторыі беларускай літаратуры для юнацтва і аб юнацтве. Погляд на маладых як бы "збоку", назіранні старэйшага майстра слова, як тыя шукаюць на роднай зямлі "прасторы жыцця", знаходзяць і не знаходзяць іх, часамі, заблудзіўшыся ў трох соснах. "Жураўліныя крыкі" вайны ў аповесцях В. Быкава з надзеяй "дастукацца" з паднябесся да душ і сэрцаў тых, хто жыве сёння на зямлі, хто застаўся, выжыў у той страшнай бойні, жаданне "дапісаць" лёсы і "даткаць" палатно жыццяў чалавечых, разгадаць матывы іх паводзін ужо ў мірным, не менш экстрэмальным часе на мяжы "вайны і міру", а значыць, на пярэдніх рубяжах дабра і зла.

Ужо не аднымі ўзорамі, не адной ці некалькімі ніткамі, а фантасмагорыяй фарбаў, адценняў, філасофска-канцэптуальнай заглыбленасцю не толькі ў тое, што было, што ёсць, што будзе, але і ў тое, што можа быць з чалавекам, магло б быць, тчэ свае мастцкія палотны невялікіх празаічных формаў "парушальнік спакою" Я. Сіпакоў – "Усе мы з хат", "Жыві, як хочацца", "Пыл пад нагамі" і інш. "Плынь свядомасці" ў празаічных рэчах сярэдняга фармату – творах В. Іпатавай. "Мелодыка" і складаная праблематыка аповесцей В. Гігевіча – "Мелодыя забытых песень", "Калі ласка, скажы", "Жыціва", "Дом, да якога вяртаемся".

Фрагментарныя лёсы юнацтва – у аповесцях І. Навуменкі. Пранікнёнасць, даходлівасць, эмацыянальнасць, настраёвасць,

займальнасць і глыбіня псіхалагічных станаў душы асобы ў І. Шамякіна – “Трывожнае шчасце” – цыкл з пяці аповесцей “Непаўторная вясна”, “Начныя зарніцы”, “Агонь і снег”, “Пошукі і сустрэчы”, “Мост”; “Шлюбная ноч”, “Гандлярка і паэт” і інш.

Фантасмагарычныя экзерсісы маладых у прозе, сацыяльныя ўтопіі, пражэкты маральных “усплёскаў душы”, вытанчанасць узораў і загадкавасць малюнкавых сюжэтаў у А. Федарэнкі, У. Сцяпана, Б. Пятровіча (“Шчасце быць...”). Вастрыня пастаноўкі праблематыкі, суровае перапляценне чорна0белых, у першую чаргу, але і рознакаляровых ніцей у аповесцях зборніка Ю. Станкевіча “Любіць ноч – права пацукоў”. Настроенасць на святло і цені ў пачынаючых.

Мастацкая палітра беларускай аповесці ХХ ст. надзвычай багатая, шматкаляровая, з вострымі і нярэдка супярэчлівымі, моцна зацягнутымі вузламі, заглыбленная ў само жыццё. Фрагментарна, але найбольш поўна і вычарпальна беларуская аповесць ХХ ст. даследуе жывую плынь часу, рух жыцця, чалавека ў сваім часе. Выткана мазаічнае, але цэласнае палатно – “габелен жыцця” – з яркімі фарбамі лёсаў чалавека – лёсаў краіны, з тонамі і паўтонамі быту і быцця, з нюансамі людскіх адчуванняў на кожным павароце, “у віры жыцця” (М. Зарэцкі), “пад сонцам” (М. Зарэцкі), з усімі “Дробязямі жыцця” (П. Галавач), з яго “Журбой у стыле рэтра” (Я. Сіпакоў) і “Спадзяваннямі на радасць” (Я. Сіпакоў).

Жанр – гэта канвенцыя. Сказана даўно. Азначэнне жанру гаворыць аб тым, што паміж пісьменнікам і чытачом існуе своеасаблівая дамоўленасць, “негалоснае” пагадненне аб тым, як трэба ўспрыймаць той ці іншы твор, што закладзена ў ім, што можна чакаць ад яго, а чаго ні ў якім разе няварта патрабаваць пры любым падыходзе ці пры ўсякім разглядзе. Жанр – канвенцыя – своеасаблівая заява мастака, зварот пісьменніка да чытача аб форме падачы матэрыялу, аб змесце і спосабе ўспрыняцця самога твора. У той жа час жанр мае ў сабе і пэўныя характэрныя рысы, тое агульнае, устойлівае але і адметнае, што адрознівае яго ад такіх жа іншых і што можа паўтарацца з твора ў твор, а таму і абумоўлівае пэўны спецыфічны рад, які найбольш поўна і дасканала ў межах абранай формы, у адпаведнай “рамцы”, “фармаце” раскрывае зменлівую гістарычную ці жывую штодзённую рэчаіснасць.

Кожнай такой “праўдзе жыцця” адпавядае свая жанравая спецыфіка твора. Раскрыць “чалавечае ў чалавеку” можна самымі празнымі сродкамі, але вось паказ самага набалелага, “тэмпературы кіпення страсцей”, хвалюючага і нечаканага вымушае пэўнага адбору эмоцый, накалу

пачуццяў, дынамікі разгортвання падзей адпаведнай формы і ступені падыходу. Такой формай, якая раскрывае ўзлёт ці падзенне чалавечага духу, трагедыйнасць ці дынаміку прыняцця рашэння ў пэўны момант чалавечага існавання на белым свеце з'яўляецца аповесць. Жанр, які стаў любімым для многіх пісьменнікаў, не менш распаўсюджаны і значымы, чым апавяданне, раман, ці іх разнавіднасці – навела, раман-эсэ, раман-споведзь, раман-біяграфія ці нават раманы-хронікі, раманы-эпапеі. "Люблю пісаць апавяданні", – прызнаваўся Я. Брыль, якога па праву называюць рыцарам малых жанраў у прозе – апавядання і аповесці. Аўтар стварыў "кнігу адной маладосці" – раман "Птушкі і гнёзды", які застаецца адзіным у творчай практыцы пісьменніка. Пры гэтым вядомы майстар дадаваў, што на любую тэму можа глядзець выключна "праз прызму" невялікай празаічнай формы.

Шлях ад апавядання да аповесці ў беларускай прозе вельмі кароткі і абсалютна незаўважны. Часта іх нават не адрозніваюць, адны і тыя ж празаічныя рэчы называюць і аповесцю і апавяданнем, як, напрыклад, "Прыгранічны манастыр" Р. Мурашкі – адзін з першых папулярных да вайны твораў авантурна-прыгодніцкага жанру, першы, бадай, беларускі дэтэктыў. Такіх прыкладаў шмат. Вядома, што ўсе кароткія рэчы ў рускай літаратуры XVIII–XIX стст. называліся аповесцямі ("Аповесці Белкіна" А.С. Пушкіна) у той жа час як разгорнутыя ў вуснай ці летапіснай форме чалавечыя лёсы насілі назвы "апавяданне старога салдата", "апавяданне бацькі", "апавяданне юнкера", "апавяданне правінцыяла", мелі разгорнуты сюжэт, як у аповесці, яле такімі не лічыліся: "Жыццё Аляксея, чалавека божага", "Як хадзіла Багародзіца па пакутах". Часцей такія рэчы насілі дакументальны характар, падкрэслівалася, што гэта не "белетрыстыка" (сачыненне), а "жывыя кавалкі з жыцця жывых людзей" (20-я гады ХХ ст.), нешта такое, што запісана са слоў відавочцаў, жывых удзельнікаў гістарычных падзей ці тых, хто склаў славу айчыннай культуры, альбо запісвалася тое, што асабліва засела ў народнай памяці. Аўтар у аповесці менш заўважны, чым у апавяданні. Аповесць мае большую ступень аддаленасці, у ёй большая дыстанцыя паміж з'явай, падзеяй, характарам персанажа і самім апавядальнікам, "погляд, як бы збоку" вельмі адчувальны, падкрэслены сюжэтна і ў абмалёўцы.

У аповесці, як правіла, прыцягваюць увагу неардынарныя характары, натуры яркія, глыбокія, малююцца вострыя і напружаныя сітуацыі. Аповесць, як правіла, не адкладваюць на наступны раз, каб дачытаць. Яна ці захоплівае, ці не, выклікае суперажыванні або пакідае раўнадушным. Па

змесце беларуская аповесць прайшла магутны, часам пакручасты, але яркі і захапляючы шлях. Заглыбіўшыся ў душу простага чалавека ў творчасці М. Гарэцкага, В. Ластоўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча (вершаваная аповесць "Гапон"), Ядвігіна Ш., пазней знайшоўшы філасофскае асэнсаванне чалавека і свету ў аповесцях Я. Коласа, К. Чорнага, М. Лынькова, Я. Маўра, атрымаўшы рамантычна-завостранае праламленне часу і чалавечага характару ў прозе М. Зарэцкага, набыўшы сацыяльную прыроду ў творах В. Каваля, С. Баранавых, Б. Мікуліча, Я. Нёманскага, беларуская аповесць інтэнсіўна развівалася ў напрамку заглыблення ў свет чалавека і чалавека ў свеце.

Аповесці І. Шамякіна, Я. Брыля, А. Карпюка, М. Лупсякова, Л. Арабей значна пашырылі гарызонты аналітычнай прозы, засведчылі аб росквіце жанру і сцвердзілі адметнасць і непаўторнасць эстэтыкі гэтай жанравай формы. Цеснае спалучэнне разведвацельных функцый, мабільнасці і вастрыні новага погляду на з'явы рэчаіснасці зрабілі ў беларускай літаратуры аповесць адным з самых дэмакратычных жанраў, з відавочнай дэмакратызацыяй, "размуроўваннем" формы, зместу, героя, стылю. Беларуская аповесць ішла ў авангардзе "перабудовы чалавека па новаму штату" (Ф.М. Дастаеўскі), разведваючы новыя шляхі да гармоніі ўзаемаадносін паміж людзьмі, раскрываючы жаданне жыць не па мане, без двайных стандартаў, захоўваючы чысціню і рамантыку духу. Такія аповесці М. Стральцова, У. Караткевіча, Я. Сіпакова, І. Чыгрынава, І. Пташнікава, В. Адамчыка, В. Быкава.

Невыпадкова ў жанры аповесці сталі мажлівымі "формулы часу": "Усе мы з хат" (Я. Сіпакоў), "Сена на асфальце" ("вёска ў горадзе") – М. Стральцова, "У тумане", "Знак бяды" (В. Быкаў).

Навізну філасофска-канцэптуальнага падыходу да жыцця дэманструюць празаічныя творы апошніх гадоў Я. Сіпакова, В. Іпатавай, В. Гігевіча, якія выступаюць за каштоўнасць чалавечага жыцця на роднай зямлі, за паўнату духу, адметнасць людскіх адчуванняў. Аповесць у беларускай літаратуры – самы распаўсюджаны, найбольш мабільны, разведвальны, дынамічны жанр.

Літаратурны даследчык Г.Д. Гачаў у кнізе "Змястоўнасць мастацкіх форм (эпас, лірыка, тэатр)" пісаў: "Форма ёсць не толькі канструкцыя, але і светаўспрыманне". Не пагадзіцца з гэтым нельга. Гсторыя беларускай аповесці, яе эвалюцыя якраз выразна пацвярджае дадзены тэзіс. Г.Д. Гачаў працягваў: "Форма – гэта асваенне быцця і чалавека: апрануўшы чалавека ў мундзір, армія гаворыць: ён – мой, ён – ваенны. Праз форму кавалак

быцця і кожны чалавек, які нараджаецца на свет, пра якога толькі можна сказаць, што ён ёсць, але яшчэ нельга сказаць, што ён ёсць, – становіцца чымсьці, г. зн. праяўляе пэўную сваю сутнасць".

У жанры аповесці чалавечая сутнасць праяўляецца, на нашу думку, найбольш канцэтравана, ярка і пераканаўча. Аб гэтым сведчыць эвалюцыя жанру аповесці ў беларускай літаратуры.

**А.Я. Рак**

## АСАБЛІВАСЦІ КАМПАЗІЦЫІ "ДЫЯЛОГУ ЛІТОЎСКАГА ШЛЯХЦІЦА" Г. ПЕЛЬГРЫМОЎСКАГА

Зусім нядаўна беларускія літаратуразнаўцы пашырылі поле сваіх даследаванняў, уключыўшы ў гісторыю беларускай літаратуры шэраг таленавітых польскамоўных паэтаў канца XVI – пачатку XVII ст. Гэта такія аўтары як Андрэй Рымша, Ян Казаковіч, Ян Пратасовіч і найбольш цікавы для нас Гальяш Пельгрымоўскі.

Г. Пельгрымоўскі быў не толькі паэтам і мемуарыстам эпохі Рэнесансу, ён займаў пачэсную пасаду пісара Вялікага Княства Літоўскага, быў актыўным палітычным дзеячам. Г. Пельгрымоўскі пакінуў некалькі гістарычных паэм на дакументальнай аснове, сярод якіх "Пасольства Льва Сапегі да вялікага князя маскоўскага", "Размова аднаго паляка з маскалём на замку маскоўскім у годзе 1601", "Дыялог літоўскага шляхціца…".

Напісаны ў 90-я гады XVI ст. "Дыялог літоўскага шляхціца…" лічыцца адным з самых вялікіх твораў Пельгрымоўскага, яго поўная назва: "Dialog slachcica litewskiego prawdziwy wojny Inflanckiej… Króla... Stefana z Księdzem Moskiewskim od początku do końca krótko zebrany". Паэма была надрукаваная ў Вільні ў друкарні Якуба Марковіча ў 1594 г.

"Дыялог літоўскага шляхціца…" прысвечаны Лівонскай вайне. Твор Г. Пельгрымоўскага адрозніваецца ад астатніх тэматычна блізкіх паэм найперш задачамі, пастаўленымі аўтарам. Г. Пельгрымоўскі стараўся не проста расказаць пра асноўныя падзеі гэтай вайны, але і пераканаць чытача ў тым, што імкненне Масковіі завалодаць Інфлянтамі – не абгрунтаванае гістарычна і супярэчыць усім чалавечым законам. У той жа час ваенныя дзеянні з боку Вялікага Княства Літоўскага, паводле канцэпцыі аўтара, з'яўляюцца толькі мерамі неабходнай абароны